# «ВЯСНА ПІША ВЕРШЫ КВЕТКАМІ»

Напярэдадні свята 8 Сакавіка ў народным літаратурным музеі ўніверсітэта адбылося адкрыццё фотавыставы кандыдата біялагічных навук, дацэнта, загадчыка кафедры батанікі Леанарда Міхайлавіча Мяржвінскага «Вясна піша вершы кветкамі». На ёй прысутнічалі студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта.



Як расказаў Леанард Міхайлавіч, з дзяцінства яго ўражвала прыгажосць роднага краю. Любіў ён і біялогію, заўсёды з задавальненнем па некалькі разоў перачытваў у газетах і часопісах артыкулы, прысвечаныя свету раслін і жывёл.

Захапленне кветкамі пачалося яшчэ ў школьныя гады. Аўтар выставы ўспамінае, што падчас вучобы ў яго была самая вялікая ў вёсцы калекцыя цюльпанаў, у дзясятым класе яна папоўнілася адзінаццаццю гатункамі руж. Вырошчваў іх Л.М. Мяржвінскі не толькі для сябе. Палюбавацца кветкамі прыходзілі з усёй вёскі. А са з'яўленнем першага фотаапарата прыгажосць кветак Леанард Міхайлавіч адлюстроўваў у сваіх фотаработах.

Прымула, пралескі, сныць, сон-трава, гіяцынты... Усе кветкі, прадстаўленыя на выставе (а іх налічваецца каля двух дзясяткаў), можна вырошчваць самім, галоўнае – жаданне. Некаторыя з іх выкладчык выкарыстоўвае пры заварванні гарбаты, у кулінарыі. Так, з мядзведжай цыбулі можна прыгатаваць вельмі смачны салат.

Кветкі заўсёды ідуць побач з паэзіяй, таму студэнты пятага курса падрыхтавалі вершы беларускіх пісьменнікаў. Свае ўласныя творы прадставілі дацэнт кафедры літаратуры Вольга Іванаўна Русілка і арганізатар выставы, старшы выкладчык гэтай жа кафедры Ірына Вацлаваўна Саматой.

Госці літаратурнага музея ў гэты дзень змаглі не толькі палюбавацца прыгажосцю кветак, але і пачаставацца знакамітай гарбатай – «прываротным зеллем» ад траўніка Леанарда.

**Юлія ГАЎРЫЛЕНКА,**
**студэнтка 5 курса ФлФ.**
**Фота аўтара.**